Установа адукацыі
«Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт імя Еўфрасінні Полацкай»

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Рэктар установы адукацыі
«Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт
імя Еўфрасінні Полацкай»
__________ Ю.Я. Раманоўскі
«27» 06 2025 г.
Рэгістрацыйны № УД-225/25/уч.

# ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСКАЙ КУЛЬТУРЫ І ЛІТАРАТУРЫ

Вучэбная праграма ўстановы адукацыі па
вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці
**6-05-0231-03 «Лінгвістычнае забеспячэнне міжкультурнай камунікацыі (англійская мова, нямецкая мова)»**

2025 г.

Вучэбная праграма складзена на аснове адукацыйнага стандарта вышэйшай адукацыі па спецыяльнасці АСВА-6-05-0231-03-2023 і вучэбнага плана спецыяльнасці 6-05-0231-03 «Лінгвістычнае забеспячэнне міжкультурнай камунікацыі (англійская мова, нямецкая мова)». Рэгістрацыйны № 07-23/уч. ГФ ад 04.04.2023 г. для дзённай формы атрымання вышэйшай адукацыі

**СКЛАДАЛЬНІК:**

Таццяна Робертаўна Багарадава, дацэнт кафедры сусветнай літаратуры і замежных моў установы адукацыі «Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт імя Еўфрасінні Полацкай», кандыдат філалагічных навук, дацэнт

**РЭКАМЕНДАВАНА ДЛЯ ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**

Кафедрай сусветнай літаратуры і замежных моў установы адукацыі «Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт імя Еўфрасінні Полацкай»
(пратакол № 7 ад «06» 06 2025 г.);

Навукова-метадычным саветам установы адукацыі «Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт імя Еўфрасінні Полацкай»
(пратакол № 7 ад «27» 06 2025 г.)

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбная праграма вучэбнай дысцыпліны «Гісторыя беларускай культуры і літаратуры» прызначана для студэнтаў трэцяга курса ўстановы адукацыі «Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт імя Еўфрасінні Полацкай» спецыяльнасці 6-05-0231-03 «Лінгвістычнае забеспячэнне міжкультурнай камунікацыі (англійская мова, нямецкая мова)» і з'яўляецца дысцыплінай модуля «Арганізацыя турызму».

Дадзеная вучэбная дысцыпілна заклікана адыграць пазітыўную ролю ў падрыхтоўцы кваліфікаваных спецыялістаў, у прапагандзе дасягненняў і набыткаў нацыянальнага гістарычнага і мастацтва слова.

На сучасным этапе працягваецца пераасэнсаванне гісторыі і мастацкіх з'яў, выпрацоўваюцца новыя крытэрыі іх ацэнкі.

Сучасны гісторыка-культурны і літаратурны кантэкст прадугледжвае новыя падыходы, канцэпцыі, прыярытэты. Аднавілася аб'ектыўная карціна гістарычнага развіцця, нацыянальнага мастацтва слова, беларуская літаратура XX – XXI стагоддзя разглядаецца як цэласны гісторыка-культурны працэс, па-іншаму выглядае перыядызацыя.

Праграма арыентуе на канцэптуальнае навуковае разуменне гісторыі нашай краіны, беларускай літаратуры, ідэйна-эстэтычнага руху, нацыянальнай спецыфікі, мастацкіх формаў адлюстравання і светапазнання, жанрава-стылёвых тэндэнцый развіцця, спасціжэнне гуманістычнай філасофіі і засваенне духоўных каштоўнасцей, якія закладзены ў гісторыі і творах як класічнай спадчыны, так і сучасных майстроў слова. Галоўная мэта вучэбнага курса: раскрыць разнастайнасць і асаблівасці гісторыка-літаратурнага працэсу XX ст. – пачатку XXI ст.

Праграма перш за ўсё скіравана на працэс ўдасканалення асобы, выхаванне ў маладога пакалення асноў сістэматызавання ведаў, напрацоўку новых падыходаў да разумення гісторыі і літаратуры, а таксама на развіццё творчага мыслення студэнтаў, актывізацыю іх навукова-даследчага пошуку.

## 1. МЭТЫ І ЗАДАЧЫ ДЫСЦЫПЛІНЫ

**Мэты выкладання дысцыпліны:**

Галоўная мэта – пазнаёміць студэнтаў з асаблівасцямі развіцця нацыянальнай гісторыі і літаратуры.

**Мэты дысцыпліны:**

-даць уяўленне пра агульныя напрамкі развіцця гісторыка-літаратурнага працэсу;

-пазнаеміць са зменай нацыянальнага гістарычнага кантэксту, даць уяўленне пра мастацка-светапоглядныя сістэмы;

-прааналізаваць нацыянальны гістарычны кантэкст, месца і ролю беларускіх аўтараў у літаратурным працэсе.

**Задачы вывучэння дысцыпліны:**

-даць студэнтам рознабаковыя веды па дысцыпліне;

-навучыць арыентавацца ў свеце нацыянальнай гісторыі і мастацкіх твораў;

-выпрацаваць крытэрыі разумення канкрэтна-гістарычнай, нацыянальнай і агульначалавечай значнасці беларускай спадчыны;

-выхоўваць эстэтычны густ, адчуванне прыгожага ў жыцці і літаратуры.

Студэнт павінен набыць наступную **спецыялізаваную кампетэнцыю:**

выкарыстоўваць веды пра асаблівасці нацыянальнага культурнага і літаратурнага развіцця для ажыццяўлення камунікацыі на мове носьбіта.

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны «Гісторыя беларускай культуры і літаратуры» студэнт павінен:

**ведаць:**

-шляхі і асноўныя этапы нацыянальнага гісторыка-культурнага развіцця;

-канкрэтна-гістарычнае, нацыянальнае і агульначалавечае значэнне мастацкіх твораў, сучасныя ацэнкі мастацкіх з'яў папярэдніх эпох;

**умець:**

-сумяшчаць тэарэтычныя веды з вывучэннем канкрэтных грамадскіх і літаратурных з'яў;

-каментаваць гісторыка-літаратурны кантэкст, характарзуючы яго з культуралагічнага, гісторыка-бытавога, літаратуразнаўчага і іншых пунктаў погляду;

**валодаць:**

-адпаведным паняційным і тэрміналагічным апаратам;

-сучаснай метадалогіяй і методыкай навуковых даследаванняў.

**Сувязі з іншымі вучэбнымі дысцыплінамі:** для засваення дадзенай вучэбнай дысцыпліны неабходна вывучэнне такой вучэбнай дысцыпліны, як «Беларуская мова і культура маўлення», а вучэбная дысцыпліна «Гісторыя беларускай культуры і літаратуры» неабходна для засваення «Беларускай літаратуры» і «Сучаснай беларускй літаратуры».

**Форма атрымання вышэйшай адукацыі – дзённая.**

У адпаведнасці з вучэбным планам установы адукацыі па спецыяльнасці на вывучэнне вучэбнай дысцыпліны адводзіцца: усяго вучэбных гадзін – 108 (3 з.а.), з іх 34 гадзіны аўдыторных заняткаў (лекцыі – 24 гадзіны, практычныя заняткі – 10 гадзін).

Самастойная праца студэнтаў – 74 гадзіны.

Вучэбная дысцыпліна вывучаецца на 3 курсе ў 5 семестры.

Форма прамежкавай атэстацыі – экзамен.

## ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

**Тэма 1. Культура, побыт, вераванні насельніцтва на тэрыторыі Беларусі ў эпоху першабытнасці**

Асноўныя археалагічныя культуры бронзавага і жалезнага вякоў. Узнікненне прадметаў побыту, зброі, твораў мастацтва ў людзей першабытнага грамадства на тэрыторыі Беларусі. Татэмізм, фетышызм, анімізм як дахрысціянскія вераванні і ўяўленні. Пантэон паганскіх багоў. Персанажы народнай дэманалогіі (ваўкалак, лясун, русалка і інш.). Вытокі беларускага народнага календара. Каляды. Гуканне вясны. Вялікдзень. Культ продкаў (Радаўніца, Дзяды). Купалле. Абрады і звычаі. Сямейныя святы. Фальклор як адлюстраванне паганскіх уяўленняў. Архетыпы менталітэту.

**Тэма 2. Культура беларускіх зямель у IX – першай палове XIII ст.**

Увядзенне хрысціянства на Беларусі. Візантыйскія традыцыі архітэктуры. Полацкая і гродзенская архітэктурныя школы. Храмы Полацка (Сафійскі сабор, Спаса-Прэабражэнская царква і інш.). Полацкі дойлід Іаан. Інтэр'еры храмаў, фрэскі. Пісьменнасць. Помнікі эпіграфікі (берасцяныя граматы, графіці, Барысавы камяні). Пачатак летапісання. Полацкі летапіс. Рукапісныя кнігі. Мастацкае афармленне кнігі. Школы пры манастырах. Е. Полацкая, яе роля ў айчыннай культурнай спадчыне. Аратарскае майстэрства К. Тураўскага, яго малітоўная паэзія. Узнікненне і развіццё цэнтраў манументальнага жывапісу ў Полацку, Гродне, Віцебску. Фрэскі Спаса-Прэабражэнскай царквы ў Полацку. Народная музыка. Праваслаўная царкоўная музыка. Развіцце дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Ювелірныя вырабы. Крыж Лазара Богшы і яго лёс. Роля візантыйскай і старажытнарускай культуры ў дойлідстве, жывапісе, музыцы. Адметнасці побыту (жыллё, адзенне, стравы ванне).

**Тэма 3. Культура беларускіх зямель у другой палове XIII–XV ст.**

Утварэнне ВКЛ, яго полікультурны характар. Фарміраванне беларускай народнасці. Станаўленне старажытнабеларускай мовы, яе дзяржаўны статус. З'яўленне перакладной царкоўнай і свецкай літаратуры. Рост гарадоў як цэнтраў культуры. Адметнасці тагачасных архітэктурных пабудоў. Асноўныя стылі (раманскі, готыка). Мураванае дойлідства, яго абарончы характар. Камянецкая вежа. Замкі ў Лідзе, Крэве, Навагрудку, Гродне. Манументальны жывапіс. Нараджэнне свецкага жывапісу (партрэт), яго параднасць. Разьба па дрэве, каменю. Скульптура.

**Тэма 4. Культура эпохі Адраджэння і Рэфармацыі на Беларусі (XVI ст.).**

Перадумовы пашырэння ідэй Адраджэння на Беларусі. Агульнае і адметнае ў айчынным і заходнееўрапейскім Рэнесансе. Пашырэнне Рэфармацыі на Беларусі. Ф. Скарына як пачынальнік усходнеславянскага і беларускага кнігадрукавання. Роля І. Фёдарава, П. Мсціслаўца ў нараджэнні кнігавыдавецкай традыцыі на рускіх і ўкраінскіх землях. Будаўніцтва палацава-замкавых комплексаў (Мір, Геранёны). Цэрквы-крэпасці (Сынкавічы, Мураванка, Супрасль). Ляхавіцкі замак. Адміранне абарончых рыс і пашырэнне свецкасці ў дойлідстве. Кальвінскія зборы з рысамі готыкі і рэнесансу. Манументальны жывапіс. Фрэскі цэркваў. Сармацкі партрэт. Мініяцюра і кніжная графіка. Гравюры Ф. Скарыны. Разьба па дрэве. Летапісанне, рукапісная кніга. Статут ВКЛ, яго 3 рэдакцыі. Л. Сапега. Культурна- асветніцкая дзейнасць Ф. Скарыны, М. Гусоўскага, С. Буднага, В. Цяпінскага, гуманістычныя ідэі ў іх духоўнай спадчыне. Канфесійны характар асветы. Пратэстанцкія школы. Вучоба моладзі ў еўрапейскіх універсітэтах. Асноўныя рысы менталітэту эпохі Адраджэння і Рэфармацыі. Уклад нацыянальнай культуры ў стварэнне агульнаеўрапейскіх каштоўнасцей эпохі Рэнесансу.

**Тэма 5. Культура Контррэфармацыі і барока. Асветніцтва на Беларусі.**

Контррэфармацыя. Брэсцкая царкоўная ўнія 1596 г., яе ўплыў на стан беларускай культуры. Негатыўнае ўздзеянне вынікаў разбуральных войн на культурнае жыццё. Праблема самазахавання беларускай культуры ва ўмовах узмацнення паланізацыі. Асветніцтва ў Еўропе, яго асноўныя рысы. Распаўсюджванне асветніцкіх ідэй, іх плыні на Беларусі. З'яўленне і сцвярджэнне новага мастацкага стылю – барока. Помнікі ранняга, сталага, позняга (віленскага) барока, іх характэрныя рысы. Спалучэнне рысаў барока і класіцызму ў помніках пераходнага стылю (Ружанскі палац і інш.). Уплыў Асветніцтва і класіцызму на архітэктуру. Фрэскавы роспіс (Богаяўленская царква Куцеінскага манастыра ў Магілёве, Святадухаўская царква Тупічэўскага манастыра ў Мсціславе і інш.). Афармленне і выдзяленне мясцовых школ жывапісу. Стварэнне родавых партрэтных галерэй у палацах. Барочная драўляная скульптура. Пашырэнне рэалістычных тэндэнцый у іканапісе. Уплыў ракако і класіцызму на скульптуру. Народныя гульні. Скамарохі. Батлейка. Узнікненне нотадрукавання. Музыка барока – "Полацкі сшытак". Школьны тэатр. Мецэнацтва магнатаў. М.К. Агінскі, яго "сядзіба музаў" у Слоніме. Полацкі езуіцкі калегіум. Узнікненне гісторыка-мемуарнага, палемічнага, сатырычнага літаратурных жанраў ("Дзённік" Ф. Еўлашэўскага, Баркалабаўская хроніка, М. Сматрыцкі, Л. і. С. Зізаніі, А. Філіповіч). Культурна-асветніцкая дзейнасць С. Полацкага, значэнне яго спадчыны для ўсходніх славян. Літоўская метрыка – дзяржаўны архіў ВКЛ. Слуцкія паясы. Карэліцкія шпалеры.

**Тэма 6. Культура беларускіх зямель у канцы XVIII – XIX ст.**

Уключэнне беларускіх зямель у склад Расійскай імперыі, уплыў палітычных падзей на стан культуры. Нелегальныя таварыствы (філаматаў, філарэтаў), легальныя культурна-асветніцкія гурткі ў Вільні, Мінску, Віцебску. Уздзеянне польскай і рускай культур на беларускую. Адток дзеячаў культуры з Беларусі. Уплыў падаўлення паўстання 1863 – 1864 гг. на грамадска-культурнае жыццё. Рост нацыянальнай самасвядомасці, станаўленне беларускай мовы, літаратуры як сведчанні фарміравання нацыі. Полацкая езуіцкая акадэмія. Віленскі ўніверсітэт як цэнтр культурнага жыцця краю. Пачаткі навуковага беларусазнаўства (Я. і К. Тышкевіч, А. Кіркор і інш.). Русіфікацыя сістэмы адукацыі пасля падаўлення паўстання 1830–1831 гг. Горы-Горацкі земляробчы інстытут. Пашырэнне сеткі школ у другой палове XIX ст. Шырокае развіццё беларусазнаўства. Працы П. Шпілеўскага, П. Шэйна, І. Насовіча, М. Федароўскага, М. Нікіфароўскага, Е. Раманава і інш. Станаўленне новай беларускай літаратуры. Паэмы "Энеіда навыварат", "Тарас на Парнасе". А. Міцкевіч і рамантычны культ нацыянальнай гісторыі, народнага побыту. Я. Чачот. В. Дунін-Марцінкевіч, У. Сыракомля, П. Багрым і інш. Дзяржаўныя і прыватныя друкарні. Губернскія перыядычныя выданні, іх накіраванасць, мова. Публічныя бібліятэкі. Прыватныя бібліятэчныя зборы (Радзівілаў, Храптовічаў і інш.). Газета "Мужыцкая праўда". Часопіс "Гоман". Аднаўленне беларускага кнігадрукавання. Працяг развіцця нацыянальнай ідэі ў творах Ф. Багушэвіча, А. Гурыновіча, Я. Лучыны. Прыватныя тэатральныя трупы. З'яўленне прафесійнай беларускай драматургіі. Тэатр В. Дуніна-Марцінкевіча. Нараджэнне беларускай оперы (Сялянка"). Батлейка. Панаванне класіцызму ў палацава-сядзібным дойлідстве, горадабудаўніцтве (палацавы комплекс у Гомелі і інш.). Змяненне знешняга аблічча гарадоў. Адыход ад класіцызму ў бок эклектыкі і гістарызму. Вядучыя жанры жывапісу: бытавы, гістарычны, партрэт, краявід. Уздзеянне рускіх "перасоўнікаў", фарміраванне рэалізму.

**Тэма 7. Культура Беларусі ў пачатку XX ст.**

Узмацненне шавінізму ў палітыцы царызму. Змаганне за адраджэнне беларускай культуры, мовы. Газета "Наша Ніва", яе роля ў развіцці беларускай літаратуры, друку, складванні і згуртаванні нацыянальнай інтэлігенцыі. Беларускія выдавецтвы ў Вільні,

Пецярбургу. Культурна-нацыянальнае развіццё ў час існавання БНР. Навуковыя даследаванні гісторыі Беларусі, мовы і этнаграфіі беларусаў. Я. Карскі як заснавальнік беларускага мовазнаўства. В. Ластоўскі і яго "Кароткая гісторыя Беларусі". Адметнасці беларускай літаратуры нашаніўскага перыяду. Я. Купала, Я. Колас, М. Багдановіч, Цётка, Ц. Гартны, З. Бядуля і інш. Станаўленне беларускага прафесійнага тэатра. Беларускія вечарыны. І. Буйніцкі і яго тэатральная трупа. Беларускі перыяд творчасці М. Шагала. Водгукі на беларускае адраджэнне ў славянскім і неславянскім свеце. Уплыў Першай сусветнай і грамадзянскай войнаў на стан культуры.

**Тэма 8. Культурнае жыццё ў БССР у 20–30-я гг. XX ст.**

Палітыка беларусізацыі. Асвета і навука. Афармленне палітыкі беларусізацыі, яе сутнасць, мэты і задачы. Дзейнасць Інстытута беларускай культуры. Літаратурныя аб'яднанні. Лепшыя творы беларускай літаратуры (Я. Купалы, Я. Коласа, М. Чарота, М. Гарэцкага, К. Чорнага, Ц. Гартнага, А. Мрыя і інш.). К. Малевіч. Аб'яднанне "УНОВИС" ("Сцвярджальнікі новага мастацтва"). Віцебскі мастацкі тэхнікум. Выцясненне мадэрнізму строгім рэалізмам. Адкрыццё тэатраў БДТ-І у Мінску, БДТ-2 у Віцебску. У. Галубок і яго вандроўны тэатр. Тэатральнае і музычнае мастацтва нацыянальных супольнасцей Беларусі. Станаўленне беларускага кіно. Ю. Тарыч. Увядзенне сацрэалізму як адзінага метаду творчасці ў літаратуры і мастацтве. Праўда часу і адступленне ад яе. Новыя матывы ў творчасці Я. Купалы. Я. Коласа, К. Чорнага, М. Лынькова і інш. Цяжкасці станаўлення БДТ-І і БДТ-2. Развіццё жанраў у музыцы. Творы кампазітараў А. Багатырова, Я. Цікоцкага, М. Аладава і інш. Дзяржаўны тэатр оперы і балета БССР, яго рэпертуар. Экранізацыя беларускай прозы.

**Тэма 9. Культура Заходняй Беларусі ў 1920–1930-я гг.**

Уключэнне Заходняй Беларусі ў склад Польшчы і далейшы лёс беларускай культуры. Паланізацыя. Дзейнасць Таварыства беларускай школы, Беларускага інстытута гаспадаркі і культуры. Працы М. Гарэцкага, А. Луцкевіча, А. Станкевіча, Б. Тарашкевіча і інш. Віленскі беларускі музей імя І. Луцкевіча, яго роля ў культурным жыцці краю. Ажыўленне краязнаўчага руху, адкрыццё музеяў. Асноўныя плыні, тэматыка заходнебеларускай літаратуры. Творы Н. Арсенневай, М. Танка, У. Жылкі, К. Сваяка і інш. Беларускія выдавецтвы. Часопісы і газеты ("Маланка", "Шлях моладзі", "Летапіс ТБШ", "Беларускі летапіс", "Беларуская крыніца" і інш.). Р. Шырма. Змены ў грамадска-культурным жыцці пасля ўключэння заходнебеларускіх зямель у склад БССР.

**Тэма 10. Культурнае жыццё ў БССР у 1940–1980-я гг.**

Беларуская інтэлігенцыя ў час вайны. Страты, нанесеныя беларускай культуры вайной. Рээвакуацыя і вяртанне нацыянальных рэліквій. Дзейнасць Акадэміі навук Беларусі, уклад яе вучоных у развіццё дакладных, прыродазнаўчых і іншых галін ведаў. Падзеі вайны і пасляваеннага аднаўлення ў беларускай літаратуры. Творы Я. Коласа, М. Лынькова, А. Куляшова, К. Крапівы, А. Маўзона і інш. Усталяванне рамана ў якасці вядучага жанра прозы. Спробы пераадолення крайнасцей сацрэалізму ў літаратуры і мастацтве. Тэмы вайны і сучаснасці (В. Быкаў, Я. Брыль, А. Адамовіч, І. Мележ, І. Чыгрынаў, М. Танк і інш.). Адраджэнне тэмы гістарычнага мінулага Беларусі. У. Караткевіч. Тэатры, рэпертуарная палітыка. Выдатныя майстры сцэны ў акадэмічных тэатрах (С. Станюта, Г. Макарава, Ф. Шмакаў і інш.). Балетмайстар В. Елізар'еў і беларуская школа балету, яе міжнароднае прызнанне. Кампазітары У. Алоўнікаў, Ю. Семяняка, І. Лучанок, Э. Ханок, Л. Захлеўны і інш. Вакальна- інструментальныя ансамблі "Песняры", "Верасы", "Сябры". Самадзейныя калектывы.

Дзейнасць кінастудыі "Беларусьфільм" Творы рэжысёраў В. Турава, М. Пташука, В. Дашука і інш. Працы скульптараў З. Азгура, А. Бембеля, А. Глебава, С. Селіханава. Адыход ад парадкасці ў бок псіхалагічных вобразаў. Стварэнне мемарыяльных комплексаў ("Хатынь", "Брэсцкая крэпасць-герой" і інш.).

**Тэма 11. Сучаснае культурнае жыццё Беларусі**

Выпрацоўка асноўных напрамкаў культурнай палітыкі ва ўмовах незалежнасці Рэспублікі Беларусь. Заканадаўчая база (Законы "Аб культуры", "Аб мовах", "Аб адукацыі", "Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны" і інш.), яе рэалізацыя. Грамадскі рух за захаванне помнікаў гісторыі і культуры, вяртанне нацыянальных каштоўнасцей на Бацькаўшчыну. Адраджэнне рэлігіі, аднаўленне храмаў і вяртанне іх вернікам. Перабудова работы творчых арганізацый. Камерцыялізацыя сферы культуры, мастацтва. З'яўленне неафіцыйных творчых аб'яднанняў. Легалізацыя нефармальнага, альтэрнатыўнага мастацтва. Вяртанне забароненых твораў і імёнаў дзеячаў навукі і культуры. Уключэнне беларускай культуры ў сусветную культурную прастору. Пашырэнне "масавай культуры". Глабалізацыя і беларуская культура. Перспектывы захавання і развіцця беларускай культуры на сучасным этапе.

**Тэма 12. Культура беларускага замежжа**

Асноўныя этапы беларускай эміграцыі. Буйныя цэнтры беларускай дыяспары. Эвалюцыя ўзаемаадносін Бацькаўшчыны і дыяспары. Пашырэнне з канца 1980-х гг. сувязяў і кантактаў з беларусамі замежжа. З'езды беларусаў свету. Сучасныя праблемы нацыянальна-культурнага развіцця беларускай дыяспары. Часопісы "Беларуская думка", "Полацк" і інш. Газеты "Беларус", "Ніва" і інш. Творчасць прадстаўнікоў літаратуры беларускай дыяспары. Літаратурнае аб'яднанне "Белавежа" у Беластоку. Дзеячы музычнага мастацтва (спявак М. Забэйда-Суміцкі, кампазітары М. Равенскі і інш.). Б. Андрусішын (Данчык). Танцавальны гурт "Васілёк".

## ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ «ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСКАЙ КУЛЬТУРЫ І ЛІТАРАТУРЫ»

**Форма атрымання адукацыи – дзённая**

| Нумары раздзелаў, тэмы, заняткаў | Назва раздзела, тэмы, заняткаў; пералік вывучаемых пытанняў | Колькасць аўдыторных гадзін | | | | літаратура | формы кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | лекцыі | практычныя (семінарскія) заняткі | лабараторныя заняткі | кіруемая самастойная работа | | |
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 8 | 9 |
| 1. | **Культура, побыт, вераванні насельніцтва на тэрыторыі Беларусі ў эпоху першабытнасці**<br>1. Асноўныя археалагічныя культуры бронзавага і жалезнага вякоў.<br>2. Татэмізм, фетышызм, анімізм як дахрысціянскія вераванні і ўяўленні.<br>3. Вытокі беларускага народнага календара. | 2 | | | | Асн.: [1;2;3;4] Дадатк.: [1; 2; 3; 4] | пісьмовае апытанне, міні-кантрольная* |
| | Практычныя заняткі: "Вытокі беларускага народнага календара". | | 2 | | | | вуснае апытанне, міні-кантрольная* |
| 2. | **Культура беларускіх зямель у IX – першай палове XIII ст.**<br>1. Узнікненне і развіццё цэнтраў манументальнага жывапісу ў Полацку, Гродне, Віцебску. Фрэскі Спаса-Прэабражэнскай царквы ў Полацку.<br>2. Народная музыка. Праваслаўная царкоўная музыка.<br>3. Развіцце дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Крыж Лазара Богшы і яго лёс.<br>4. Роля візантыйскай і старажытнарускай культуры ў дойлідстве, жывапісе, музыцы. Адметнасці побыту (жыллё, адзенне, стравaванне). | 2 | | | | Асн.: [1;2;3;4] Дадатк.: [5; 6; 7; 8] | вуснае апытанне, практычныя заданні* |
| | Практычныя заняткі: "Асноўныя культурныя дасягненні старажытнага Полацка". | | 2 | | | | вуснае апытанне, практычныя заданні* |

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 3. | **Культура беларускіх зямель у другой палове XIII–XV ст.**<br>1. Утварэнне ВКЛ, яго полікультурны характар.<br>2. З'яўленне перакладной царкоўнай і свецкай літаратуры. Асноўныя стылі (раманскі, готыка).<br>3. Мураванае дойлідства, яго абарончы характар. Манументальны жывапіс. Нараджэнне свецкага жывапісу (партрэт), яго параднасць.<br>4. Разьба па дрэве, каменю. Скульптура. | 2 | | | | Асн.: [1;2;3;4] Дадатк.: [9; 10; 11] | міні-кантрольная* |
| 4. | **Культура эпохі Адраджэння і Рэфармацыі на Беларусі (XVI ст.).**<br>1. Перадумовы пашырэння ідэй Адраджэння на Беларусі.<br>2. Манументальны жывапіс.<br>3. Культурна-асветніцкая дзейнасць Ф. Скарыны, М. Гусоўскага, С. Буднага, В. Цяпінскага, гуманістычныя ідэі ў іх духоўнай спадчыне.<br>4. Асноўныя рысы менталітэту эпохі Адраджэння і Рэфармацыі. | 2 | | | | Асн.: [1;2;3;4] Дадатк.: [12; 13] | паведамленні |
| 5. | **Культура Контррэфармацыі і барока. Асветніцтва на Беларусі.**<br>1. Контррэфармацыя. Брэсцкая царкоўная ўнія 1596 г., яе ўплыў на стан беларускай культуры.<br>2. Стварэнне родавых партрэтных галерэй у палацах.<br>3. Народныя гульні. Скамарохі. Батлейка. Узнікненне нотадрукавання.<br>4. Узнікненне гісторыка-мемуарнага, палемічнага, сатырычнага літаратурных жанраў. | 2 | | | | Асн.: [1;2;3;4] Дадатк.: [14; 15] | вуснае апытанне |
| | Практычныя заняткі "Гісторыка-мемуарны, палемічны, сатырычны літаратурныя жанры". | | 2 | | | | вуснае апытанне |
| 6. | **Культура беларускіх зямель у канцы XVIII – XIX ст.**<br>1. Уключэнне беларускіх зямель у склад Расійскай імперыі, уплыў палітычных падзей на стан культуры. | 2 | | | | Асн.: [1;2;3;4] Дадатк.: [1;2;3;4] | тэст* |

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | 2. Нелегальныя таварыствы (філаматаў, філарэтаў), легальныя культурна-асветніцкія гурткі ў Вільні, Мінску, Віцебску. Уздзеянне польскай і рускай культур на беларускую. Адток дзеячаў культуры з Беларусі.<br>3. Уплыў падаўлення паўстання 1863 – 1864 гг. на грамадска-культурнае жыццё. | | | | | | |
| 7. | **Культура Беларусі ў пачатку XX ст.**<br>1. Узмацненне шавінізму ў палітыцы царызму.<br>2. Газета "Наша Ніва", яе роля ў развіцці беларускай літаратуры, друку, складванні і згуртаванні нацыянальнай інтэлігенцыі.<br>3. Беларускія выдавецтвы ў Вільні, Пецярбургу.<br>4. Культурна-нацыянальнае развіццё ў час існавання БНР.<br>5. Адметнасці беларускай літаратуры нашаніўскага перыяду.<br>6. Уплыў Першай сусветнай і грамадзянскай войнаў на стан культуры. | 2 | | | | Асн.: [1;2;3;4]] Дадатк.: [16; 17] | міні-кантрольная* |
| 8. | **Культурнае жыццё ў БССР у 20–30-я гг. XX ст.**<br>1. Палітыка беларусізацыі.<br>2. Дзейнасць Інстытута беларускай культуры.<br>3. Літаратурныя аб'яднанні.<br>4. Выцясненне мадэрнізму строгім рэалізмам.<br>5. Тэатральнае і музычнае мастацтва нацыянальных супольнасцей Беларусі.<br>6. Станаўленне беларускага кіно. | 2 | | | | Асн.: [1;2;3;4] Дадатк.: [3; 4; 5] | пісьмовае апытанне |
| | Практычныя заняткі "Новыя матывы ў творчасці Я. Купалы. Я. Коласа, К. Чорнага, М. Лынькова і інш.". | | 2 | | | | вуснае апытанне |
| 9. | **Культура Заходняй Беларусі ў 1920–1930-я гг.**<br>1. Уключэнне Заходняй Беларусі ў склад Польшчы і далейшы лёс беларускай культуры.<br>2. Паланізацыя. Дзейнасць Таварыства беларускай школы, Беларускага інстытута гаспадаркі і культуры.<br>3. Ажыўленне краязнаўчага руху, адкрыццё | 2 | | | | Асн.: [1;2;3;4] Дадатк.: [6; 7; 8] | вуснае апытанне |

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | музеяў.<br>4. Асноўныя плыні, тэматыка заходнебеларускай літаратуры. | | | | | | |
| 10. | **Культурнае жыццё ў БССР у 1940–1980-я гг.**<br>1. Беларуская інтэлігенцыя ў час вайны.<br>2. Падзеі вайны і пасляваеннага аднаўлення ў беларускай літаратуры.<br>3 . Спробы пераадолення крайнасцей сацрэалізму ў літаратуры і мастацтве. | 2 | | | | Асн.: [1;2;3;4]] Дадатк.: [3; 4; 5] | вуснае апытанне |
| | Практычныя заняткі “Дзейнасць кінастудыі “Беларусьфільм””. | | 2 | | | | вуснае апытанне |
| 11. | **Сучаснае культурнае жыццё Беларусі**<br>1. Выпрацоўка асноўных напрамкаў культурнай палітыкі ва ўмовах незалежнасці Рэспублікі Беларусь.<br>2. Адраджэнне рэлігіі, аднаўленне храмаў і вяртанне іх вернікам.<br>3. Вяртанне забароненых твораў і імёнаў дзеячаў навукі і культуры.<br>3. Пашырэнне “масавай культуры”.<br>4. Глабалізацыя і беларуская культура. | 2 | | | | Асн.: [1;2;3;4] Дадатк.: [6; 7; 8] | паведамленні |
| 12. | **Культура беларускага замежжа**<br>1. Асноўныя этапы беларускай эміграцыі.<br>2. Буйныя цэнтры беларускай дыяспары.<br>3. Літаратурнае аб’яднанне “Белавежа” у Беластоку. | 2 | | | | Асн.: [1;2;3;4]] Дадатк.: [1;2;3;4] | тэст* |
| | **Усяго:** | **24** | **10** | | | | |

**Мерапрыемствы бягучага кантролю***

## ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## ЛІТАРАТУРА

**Асноўная**

1. Баландзін, К.І. Гісторыя культуры Беларусі : дапаможнік / К. І. Баландзін ; Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт, кафедра "Гісторыя, сусветная і айчынная культура" . - Мінск : БНТУ, 2014. - 238 с.
2. Запрудскі, І.М. Гісторыя беларускай літаратуры другой паловы XIX стагоддзя : асобы і творчыя лёсы : вучэбна-метадычны дапаможнік / І. М. Запрудскі ; Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт. - Мінск : БДУ, 2018. - 165 с.
3. Пілецкі, В.А. Гісторыя культуры Беларусі : вучэбны дапаможнік для студэнтаў негістарычных факультэтаў ВНУ / В. А. Пілецкі ; Мінскі інавацыйны ўніверсітэт. - Мінск : МІУ, 2017. - 401 с.
4. Старажытная беларуская літаратура : літаратура Сярэднявечча. Літаратура Адраджэння. Барока. Класіцызм. Асветніцтва. Ад рамантызму да рэалізму. - Мінск : Вышэйшая школа, 2022. - 368 с.

**Дадатковая**

1. Багарадава, Т.Р. Гісторыя беларускай літаратуры (XIX ст. - 1970-я гады XX ст.) : вучэбна-метадычны комплекс для студэнтаў спецыяльнасці 1-21 05 06 "Рамана-германская філалогія" : у 2 частках. Частка 1 / Таццяна Робертаўна Багарадава, Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт. - Наваполацк : ПДУ, 2009. - 236 с. - Бібліягр. у канцы кожнай тэмы, с. 234-235.
2. Багарадава, Т.Р. Гісторыя беларускай літаратуры (XIX ст. - 1970-я гады XX ст.) : вучэбна-метадычны комплекс для студэнтаў спецыяльнасці 1-21 05 06 "Рамана-германская філалогія" : у 2 частках. Частка 2 / Таццяна Робертаўна Багарадава. - Наваполацк : ПДУ, 2009. - 256 с. - Бібліягр. : с. 254-255.
3. Багарадава, Т.Р. Гісторыя беларускай літаратуры і крытыкі (XIX - пачатак XX стст.) : вучэбна-метадычны комплекс для студэнтаў спецыяльнасці 1-02 03 07-01 "Англійская мова. Беларуская мова і літаратура" / Таццяна Робертаўна Багарадава, Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт. - Наваполацк : ПДУ, 2008. - 147 с. - Бібліягр. : с. 145-146.
4. Беларуская літаратура на сучасным этапе: аўтар, герой, чытач : зборнік навуковых артыкулаў: да 85-годдзя з дня нараджэння акадэміка У. В. Гніламедава : [па выніках Міжнароднай навуковай канферэнцыі, 21-22 снежня 2022 г., г. Мінск] / [уклад. : К.В. Часнакова; нав. рэд. М.У. Мікуліч; рэдкал. : М.У. Мікуліч, А.В. Вальчук, Ж.С. Шаладонава [і інш.]. - Мінск : Беларуская навука, 2023. - 288 с. : [7] л. кал. іл.
5. Гісторыя беларускай літаратуры XI - XIX ст. : у 2 т. Т. 1 : Даўняя літаратура XI - першая пал. XVIII ст. / НАН Беларусі, Ін-т мовы і літаратуры ; рэдкал. : У.В. Гніламедаў, Г.В. Кісялеў, А.А. Лойка і інш. ; навук. рэд. В.А. Чамярыцкі. - 3-е выд., выпр. - Мінск : Беларуская навука, 2010. - 909, [1] с.

Ллетошка 06

6. Гісторыя беларускай літаратуры XI - XIX ст. : у 2 т. Т. 2 : Новая літаратура другая палова XVIII - XIX стагоддзе / У. І. Мархель ; НАН Беларусі, Ін-т мовы і літаратуры ; рэдкал. : У.В. Гніламедаў, Г.В. Кісялеў, А.А. Лойка і інш. ; навук. рэд. У. І. Мархель, В.А. Чамярыцкі. - 2-е выд. - Мінск : Беларуская навука, 2010. - 581, [1] с.
7. Жураўскі, А.І. Гісторыя беларускай літаратурнай мовы : [манаграфія] / А. І. Жураўскі ; уклад. : Н.В. Паляшчук, Э.В. Ярмоленка, С.М. Макітрук; Нацыянальная Акадэмія навук Беларусі. - Мінск : Беларуская навука, 2024. - 295 с.
8. Запрудскі, І.М. Беларуская літаратура і культура XIX стагоддзя : асаблівасці развіцця і актуальныя пытанні даследавання : [манаграфія] / І. М. Запрудскі ; Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт. - Мінск : БДУ, 2021. - 145, [2] с.
9. Калядка, С.У. Беларуская паэзія ў літаратуразнаўчых даследаваннях другой паловы XX ст. : [манаграфія] / С. У. Калядка ; [нав. рэд. : І.В. Саверчанка, А.У. Бразгуноў]. - Мінск : Беларуская навука, 2024. - 249, [2] с.
10. Каяла У.І. Станаўленне і развіцце жанру беларускай байкі : манаграфія / У. І. Каяла. - Гродна : ГрДУ, 2002. - 123с.
11. Лойка, А.А. Старабеларуская літаратура : падручнік / А. А. Лойка. - Мн. : Выш. шк., 2001. - 319 с. - Зацверджана М-вам адукацыі РБ у якасці падручніка для студ. філалаг. спец. выш. навуч. устаноў.
12. Нарысы гісторыі культуры Беларусі : у 4 тамах / Нацыянальная акадэмія навук Беларусі. - Мінск : Беларуская навука, 2013 - 2017. Том 1 : Культура сацыяльнай эліты XIV- пачатку XX ст. / А.І. Лакотка, Г.І. Каспяровіч, Л.В. Ракава і іншыя. - 2013. - 573, [2] с..
13. Нарысы гісторыі культуры Беларусі : у 4 тамах / Нацыянальная акадэмія навук Беларусі. - Мінск : Беларуская навука, 2013 - 2017. - ISBN 978-985-08-1566-8.
Том 2 : Культура гарадоў X - пачатку XX ст. - 2014. - 572, [3] с. : іл..
14. Нарысы гісторыі культуры Беларусі : у 4 тамах / Нацыянальная акадэмія навук Беларусі . - Мінск : Беларуская навука, 2013 - 2017. Том 4 : Культура XX - пачатку XXI ст./ А.І. Лакотка, Т.В. Габрусь, А.С. Шамрук і іншыя]. - 2017. - 803, [3] с.
15. Сусветная спадчына Францыска Скарыны / Нацыянальная бібліятэка Беларусі, Выдавецтва "Беларуская Энцыклапедыя ім. П. Броўкі" ; пад навуковай рэдакцыяй Р.С. Матульскага ; пераклад на англійскую мову: Г.М. Каваленка, Г.В. Цітова. - Мінск : Беларуская Энцыклапедыя ім. П. Броўкі, 2017. - 421, [2] с.
16. Узнікненне кнігадрукавання ў Еўропе і Беларусі / І. Я. Вашкевіч [и др.] ; складальнік : А.А. Суша. - Мінск : Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі, 2017. - 151 с.
17. Яскевіч, А. Падзвіжнікі і іх святыні. Духоўная культура старажытнай Беларусі / А. Яскевіч. - Мн. : Полымя, 2001. - 367с. : ил.

## ПЕРАЛІК ПЫТАННЯЎ ДЛЯ ПРАВЯДЗЕННЯ ЭКЗАМЕНА

1. Творы мастацтва першабытнага грамадства на тэрыторыі Беларусі.
2. Язычніцкія вераванні і ўяўленні.
3. Вытокі беларускага народнага календара. Фальклор.
4. Прыняцце і распаўсюджванне хрысціянства, яго ўплыў на культуру беларускіх зямель (Х – першая палова XIII ст.).
5. Дойлідства беларускіх зямель у IX – першай палове XIII ст.
6. Пісьменнасць і помнікі пісьменства беларускіх зямель (Х – першая палова XIII ст.).
7. Выяўленчае і дэкаратыўна-прыкладное мастацтва Беларусі IX – першай паловы XIII ст.
8. Летапісанне, пісьмовыя помнікі Беларусі другой паловы XIII – XV ст.
9. Дойлідства Беларусі другой паловы XIII – XV ст.
10. Выяўленчае мастацтва Беларусі другой паловы XIII – XV ст.
11. Перадумовы, спецыфіка айчыннага Адраджэння і Рэфармацыі.
12. Нараджэнне кнігадрукавання на Беларусі (XVI ст.).
13. Дойлідства Беларусі эпохі Рэнесансу і Рэфармацыі.
14. Выяўленчае мастацтва Беларусі XVI ст.
15. Дойлідства Беларусі перыяду Контрэфармацыі і барока (канец XVI – першая палова XVIII ст.).
16. Выяўленчае мастацтва Беларусі канца XVI – першай паловы XVIII ст.
17. Музычнае і тэатральнае жыццё Беларусі (канец XVI – першая палова XVIII ст.).
18. Побыт (XVII – першая палова XVIII ст.).
19. Распаўсюджванне ідэй Асветніцтва на Беларусі.
20. Асвета і навука (другая палова XVIII ст.).
21. Музычнае і тэатральнае мастацтва Беларусі другой паловы XVIII ст.
22. Дойлідства і выяўленчае мастацтва Беларусі другой паловы XVIII ст.
23. Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва Беларусі (сярэдзіна і другая палова XVIII ст.).
24. Умовы, асноўныя накірункі развіцця культуры Беларусі ў канцы XVIII – XIX ст.
25. Асвета і навука (першая палова XIX ст.).
26. Тэатральнае і музычнае мастацтва Беларусі (першая палова XIX ст.).

27. Дойлідства і выяўленчае мастацтва Беларусі (першая палова XIX ст.).
28. Асвета і навука (другая палова XIX ст.).
29. Выяўленчае мастацтва Беларусі другой паловы XIX ст.
30. Дойлідства Беларусі другой паловы XIX – пачатку XX ст.
31. Тэатр і музыка (другая палова XIX ст.).
32. Бібліятэкі, музеі на Беларусі ў XIX ст., іх лёс.
33. Традыцыйная культура беларусаў, іх побыт (XIX ст.).
34. Узмацненне шавінізму ў палітыцы царызму ў пачатку XX ст.
35. Друк Беларусі ў пачатку XX ст. Газета "Наша ніва".
36. Музычнае, тэатральнае мастацтва Беларусі пачатку XX ст.
37. Выяўленчае мастацтва Беларусі пачатку XX ст.
38. Асвета і навука (пачатак XX ст.).
39. Палітыка беларусізацыі (1920-я гг.).
40. Інстытут беларускай культуры. Развіццё навукі (1920-я гг.).
41. Выяўленчае мастацтва БССР (1920-я гг.).
42. Музычнае і тэатральнае мастацтва БССР у 1920-я гг. Нараджэнне беларускага кіно.
43. Дойлідства і выяўленчае мастацтва БССР (канец 1920-х – пачатак 1940-х гг.).
44. Тэатр, музыка і кіно БССР (канец 1920-х – пачатак 1940-х гг.).
45. Асвета. Гісторыка-этнаграфічныя даследаванні ў Заходняй Беларусі (1920–1930-я гг.).
46. Мастацкая культура Заходняй Беларусі (1920–1930-я гг.).
47. Культурнае жыццё на Беларусі ў першае пасляваеннае дзесяцігоддзе.
48. Стан асветы, навукі Беларусі (другая палова 1950-х – сярэдзіна 1980-х гг.).
49. Мастацкае і літаратурнае жыццё Беларусі другой паловы 1950- х – сярэдзіны 1980-х гг.
50. Мастацкае жыццё Беларусі на сучасным этапе.
51. Навуковыя даследаванні беларускай дыяспары. Грамадска-культурныя арганізацыі і цэнтры.
52. Друк. Літаратурнае і мастацкае жыццё беларускага замежжа.

# АРГАНІЗАЦЫЯ САМАСТОЙНАЙ ПРАЦЫ СТУДЭНТАЎ

## Змест самастойнай працы студэнтаў (дзённая форма атрымання вышэйшай адукацыі)

Пры вывучэнні вучэбнай дысцыпліны, модуля выкарыстоўваюцца наступныя формы самастойнай працы: складанне канспекта-прэзентацыі, праца з прафесійнымі тэкстамі, мастацкі аналіз тэкстаў, складанне майнд-карты.

| Від самастойнай працы | Тэматычны змест і выкарыстаныя крыніцы | Колькасць гадзін |
|---|---|---|
| Паглыбленае вывучэнне тэмы 1 | **Культура, побыт, вераванні насельніцтва на тэрыторыі Беларусі ў эпоху першабытнасці**<br>Складанне канспекта-прэзентацыі па тэме “Вытоки беларускага народнага календара ”.<br>**Літаратура**:<br>Беларуская літаратура на сучасным этапе: аўтар, герой, чытач : зборнік навуковых артыкулаў: да 85-годдзя з дня нараджэння акадэміка У. В. Гніламедава : [па выніках Міжнароднай навуковай канферэнцыі, 21-22 снежня 2022 г., г. Мінск] / [уклад. : К.В. Часнакова; нав. рэд. М.У. Мікуліч; рэдкал. : М.У. Мікуліч, А.В. Вальчук, Ж.С. Шаладонава [і інш.]]; Нацыянальная Акадэмія навук Беларусі, Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры, Інстытут літаратуразнаўства імя Янкі Купалы. - Мінск : Беларуская навука, 2023. - 288 с. | 4 |
| Паглыбленае вывучэнне тэмы 2 | **Культура беларускіх зямель у IX – першай палове XIII ст.**<br>Праца з прафесійным тэкстам – аналіз «Жыціе Еўфрасінні Полацкай».<br>**Літаратура**:<br>Старажытная беларуская літаратура : літаратура Сярэднявечча. Літаратура Адраджэння. Барока. Класіцызм. Асветніцтва. Ад рамантызму да рэалізму. - Мінск : Вышэйшая школа, 2022. - 368 с. | 4 |
| Паглыбленае вывучэнне тэмы 3 | **Культура беларускіх зямель у другой палове XIII–XV ст.**<br>Мастаці аналіз старабеларускіх тэкстаў.<br>**Літаратура**:<br>Старажытная беларуская літаратура : літаратура Сярэднявечча. Літаратура Адраджэння. Барока. Класіцызм. Асветніцтва. Ад рамантызму да рэалізму. - Мінск : Вышэйшая школа, 2022. - 368 с. | 4 |

| | | |
|---|---|---|
| Паглыбленае вывучэнне тэмы 4 | **Культура эпохі Адраджэння і Рэфармацыі на Беларусі (XVI ст.).**<br>Аналіз арыгінальных тэкстаў (тры Статуты ВКЛ)<br>**Літаратура:**<br>Лойка, А.А. Старабеларуская літаратура : падручнік / А. А. Лойка. - Мн. : Выш. шк., 2001. - 319 с. - Зацверджана М-вам адукацыі РБ у якасці падручніка для студ. філалаг. спец. выш. навуч. установ. | 4 |
| Паглыбленае вывучэнне тэмы 5 | **Культура Контррэфармацыі і барока. Асветніцтва на Беларусі.**<br>Складанне канспекта-прэзентацыі па тэме "Стварэнне родавых партрэтных галерэй у палацах.".<br>**Літаратура:**<br>Лойка, А.А. Старабеларуская літаратура : падручнік / А. А. Лойка. - Мн. : Выш. шк., 2001. - 319 с. - Зацверджана М-вам адукацыі РБ у якасці падручніка для студ. філалаг. спец. выш. навуч. установ | 4 |
| Паглыбленае вывучэнне тэмы тэмы 6 | **Культура беларускіх зямель у канцы XVIII – XIX ст.**<br>Складанне канспекта-прэзентацыі па тэме "Пачаткі навуковага беларусазнаўства (Я. і К. Тышкевіч, А. Кіркор і інш.)".<br>**Літаратура:**<br>Гісторыя беларускай літаратуры XI - XIX ст. : у 2 т. Т. 2 : Новая літаратура другая палова XVIII - XIX стагоддзе / У. І. Мархель ; НАН Беларусі, Ін-т мовы і літаратуры ; рэдкал. : У.В. Гніламедаў, Г.В. Кісялеў, А.А. Лойка і інш. ; навук. рэд. У. І. Мархель, В.А. Чамярыцкі. - 2-е выд. - Мінск : Беларуская навука, 2010. - 581, [1] с. - Бібліягр. : с. 570-582. - ISBN 978-985-08-1167-7 (Т. 2). | 4 |
| Паглыбленае вывучэнне тэмы тэмы 7 | **Культура Беларусі ў пачатку XX ст.**<br>Складанне майнд-карты па тэме "Адметнасці беларускай літаратуры нашаніўскага перыяду. Я. Купала, Я. Колас, М. Багдановіч, Цётка, Ц. Гартны, З. Бядуля і інш.".<br>**Літаратура:**<br>Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя : У 4 т. Т.1 : 1901 - 1920 / НАНБ, Ин-т літаратуры імя Я.Купалы; Рэдкал.: У.В.Гніламедаў і інш. - 3-е выд. - Мн. : Беларуская навука, 2003. - 583с. | 4 |
| Паглыбленае вывучэнне тэмы тэмы 8 | **Культурнае жыццё ў БССР у 20–30-я гг. XX ст.**<br>Складанне канспекта-прэзентацыі па тэме "Адкрыццё тэатраў БДТ-I у Мінску, БДТ-2 у Віцебску".<br>**Літаратура:**<br>Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя : У 4-х т. Т.2 : 1921 - 1941 / НАНБ, Ін-т літаратуры | 2 |

| | | |
|---|---|---|
| | імя Я.Купалы; Рэдкал.: У.В. Гніламедаў і інш. - 2-е выд. - Мн. : Беларуская навука, 2002. - 903с. | |
| Паглыбленае вывучэнне тэмы тэмы 9 | **Культура Заходняй Беларусі ў 1920–1930-я гг.** Складанне майнд-карты па тэме " Асноўныя плыні, тэматыка заходнебеларускай літаратуры". **Літаратура**: Мішчанчук, М.І. Беларуская літаратура XX ст. : Вучэб. дапам. / М. І. Мішчанчук, І. С. Шпакоўскі. - Мн. : Выш. шк., 2001. - 352с. | 2 |
| Паглыбленае вывучэнне тэмы тэмы 10 | **Культурнае жыццё ў БССР у 1940–1980-я гг.** Аналіз мастацкіх тэкстаў. **Літаратура**: 1. Гісторыя беларускай літаратуры: XX стагоддзе (20-50-я гады) : Падручнік / Пад рэд. Лазарука М.А., Семяновіча А.А. - 2-е выд., дапрац. і дап. - Мн. : Выш. шк., 2000. - 511с. 2. Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя : У 4-х т. Т.3 : 1941 - 1965 / НАНБ, Ін-т літаратуры імя Я.Купалы; Рэдкал.: У.В. Гніламедаў і інш. - Мн. : Беларуская навука, 2002. - 951с. 3. Гісторыя беларускай літаратуры : другая палова XX - пачатак XXI стагоддзя : метад. рэкаменд. / Склад. А.М. Канапелька і інш. - Віцебск : ВДУ, 2002. - 18с. | 2 |
| Паглыбленае вывучэнне тэмы тэмы 11 | **Сучаснае культурнае жыццё Беларусі** Складанне майнд-карты па тэме" Пашырэнне "масавай культуры"". **Літаратура**: Гісторыя беларускай літаратуры : другая палова XX - пачатак XXI стагоддзя : метад. рэкаменд. / Склад. А.М. Канапелька і інш. - Віцебск : ВДУ, 2002. - 18с. | 2 |
| Паглыбленае вывучэнне тэмы тэмы 12 | **Культура беларускага замежжа** Аналіз мастацкіх тэкстаў **Літаратура**: Мішчанчук, М.І. Беларуская літаратура XX ст. : Вучэб. дапам. / М. І. Мішчанчук, І. С. Шпакоўскі. - Мн. : Выш. шк., 2001. - 352с. | 2 |
| Парыхтоўка да экзамена | | **36** |
| | **Усяго гадзін** | **74** |

# КАНТРОЛЬ ЯКАСЦІ ЗАСВАЕННЯ ВЕДАЎ

## Сродкі дыягностыкі вынікаў вучэбнай дзейнасці:

-тэсціраванне;
-вуснае апытанне;
-пісьмовае апытанне;
-мінікантрольная;
-паведамленні.

Дыягностыка якасці засваення ведаў ажыццяўляецца ў форме бягучага кантролю і прамежкавай аттэстацыі.

У рамках рэйтынгавай сістэмы пасняховасць студэнтаў па вучэбнай дысцыпліне ацэньваецца з дапамогай мерапрыемстваў бягучага кантролю, якія праводзяцца на працягу семестра. Мерапрыемствы бягучага кантролю праводзяцца ў час аўдыторных заняткаў. Адзнакі, атрыманыя студэнтам у ходзе бягучага кантролю, выстаўляюцца па дзесяцібальнай шкале і фіксуюцца ў журнале выкладчыка. Для студэнта, які прапусціў мерапрыемства бягучага кантролю па ўважлівай прычыне, кафедрай устанаўліваюцца дадатковыя тэрміны. Студэнтам, якія прапусцілі мерапрыемства бягучага кантролю без уважлівай прычыны, выстаўляецца 1 (адзін) бал за гэтае мерапрыемства.

Мерапрыемствы бягучага кантролю праводзяцца цягам сяместра і ўключаюць у сябе наступныя формы кантролю: практычныя заданні, мінікантрольная работа, тэст.

Вынік бягучага кантролю за семестр ацэньваецца адзнакай у балах па дзесяцібальнай шкале і выводзіцца зыходзячы з адзнак, выстаўленых выкладчыкам (выкладчыкамі) падчас правядзення мерапрыемстваў бягучага кантролю на працягу семестра, по наступнай формуле:

$$БК = Б1+Б2+Б3........+ Бn / n,$$

дзе Б1,2…n – адзнака за мерапрыемства бягучага кантролю,

n – колькасць мерапрыемстваў бягучага контролю.

Дадзеная адзнака таксама ўлічвае вынікі ўдзелу студэнта ў навукова-практычных мерапрыемствах, вучэбна-даследчай, навукова-даследчай працы студэнтаў (канферэнцыях, семінарах, алімпіядах, конкурсах, навуковых гуртках і г.д.) па профілю дысцыпліны і можа быць павышана да 10 балаў пры дасягненні значных вынікаў у гэтай працы.

Пры правядзенні прамежкавай атэстацыі (экзамена) адзнака выстаўляецца студэнтам, якія атрымалі па накапляльнай сістэме па выніках бягучага кантролю выніковую адзнаку ад 4 да 10 балаў падчас семестра і адказу на экзамене, як сярэдняя арыфметычная ад сумы адзнак, атрыманых на працягу семестра і за адказ на экзамене.

Станоўчай з’яўляецца адзнака не ніжэй за 4 (чатыры) балы.

Выніковая адзнака па вучэбнай дысцыпліне разлічваецца на аснове выніка бягучага кантролю за сяместр і адзнакі, атрыманай за адказ па білету па формуле:

$$B=k\cdot БК+(1-k)\cdot O,$$

дзе O – адзнака, атрыманая за адказ на (заліку, дыферэнцыраваным заліку) экзамене, k – вагавы каэфіцыент бягучага кантролю, роўны 0,5, БК – вынік бягучага кантролю.

**ПРАТАКОЛ УЗГАДНЕННЯ ВУЧЭБНАЙ ПРАГРАМЫ З ІНШЫМІ ДЫСЦЫПЛІНАМІ СПЕЦЫЯЛЬНАСЦІ**

| Назва дысцыпліны, з якой патрабуецца ўзгадненне | Назва кафедры | Прапановы аб зменах у змесце вучэбнай праграмы па вывучаемай вучэбнай дысцыпліне | Рашэнне, прынятае кафедрай, якая распрацавала вучэбную праграму (з указаннем даты і нумару пратакола) |
|---|---|---|---|
| Беларуская мова і культура маўлення | Кафедра сусветнай літаратуры і замежных моў | Няма | |

Загадчык кафедры сусветнай літаратуры і замежных моў, к.ф.н, К.У. Лушнеўская